*Першы, або ранні этап гістарыяграфіі* (сярэдзіна XII – канец XVIII стст.) уключае пісьмовыя помнікі рознамэтавага, спантаннага паходжання.

Найперш вылучаюцца каштоўныя меркаванні пра агульнаабрадавы строй традыцыйнай мясцовай духоўнай культуры: ранейшыя з іх змешчаны ў павучальна-крытычных творах славутага дзеяча Праваслаўнай царквы Кірылы Тураўскага (другая пал. XII ст.). Пазней характарыстыка гэтага роду выкладалася ў трактаце 1550 г. Міхалона Літвіна, зборніку "Ізмарагд" 1593 г., кнізе Я. Ласіцкага "Аб Багах жмудзінаў і інных сарматаў…" 1615 г.

Больш дакладна выяўлена стаўленне мясцовых жыхароў да нябесных падзей, і ў прыватнасці – праявы культа Сонца, у мясцовай лягендзе аб Совіі, што зафіксавана ў дадатке да перакладу "Хронікі" Іаана Малалы 1261 г. Натуральным было б чакаць паведамленняў аб каляндарнай традыцыі у мясцовых летапісах ранняга перыяду (XII–XIV ст.), але да сёняшняга часу яны (Полацкі, Пінскі, Слуцкі, інш.) мяркуюцца толькі гіпатэтычна, у той час як пазнейшыя летапісы (з XV ст.), так жа, як і матэрыялы Заканадаўчыя, Актавыя і Метрыкі ВКЛ змяшчаюць каляндарныя звесткі, пераважна, датуючага напрамку, і ў выключнай большасці, па Хрысціянскаму канону (у адрозненне ад народнай традыцыі). Сярод нешматлікіх выключэнняў – суаднясенне са святочнай датай традыцыйнага каляндарнага свята Купалля ў абмежаваны перыяд XIII–XIV стст.: Іпацеўскі летапіс, звестка за 1262 г., Дагавор літоўскіх князёў з польскім каралём Казімірам 1349 г., "Грамата Вялікага князя Літоўскага Вітаўта" 1396 г., і надзвычай рэдкая ўзгадка невядомага, але відавочна язычніцкага па паходжанню Дня Перуна ва "Уставе судовай" Вялікага князя Літоўскага Альгерда 1359 г. У цэлым, у адносінах да храналагічна-тэрміналагічных звестак яскрава вылучаецца храналагічная мяжа XIV ст., калі фіксуецца іх аўтэнтычнае ўжыванне. У наступныя часы, да XVIII ст. сярод акрэсленага кола пісьмовых крыніц сустракаюцца асобныя ўзгадкі падзей традыцыйнага календара (свята Вялікадня, Каляд, інш.), але відавочна фармальным чынам, у кантэксце Хрысціянскага календара, дапасаваныя да яго падзей. Між тым, праблемы храналогіі і храналагічнай тэрміналогіі календара тэрыторыі Беларусі заслугоўваюць спецыяльнага паглыбленага вывучэння.

Вылучаюцца рознага роду тэрміналагічныя звесткі, храналагічнага напрамку: назвы 12 месяцаў гадавога цыклу, прыведзеныя на стараславянскай мове, у асобных элементах блізкія да сучасных беларускіх назваў (да 1/3 супадзенняў) выкладаліся тасама ў царкоўна-навучальных зборніках "Пролагах" (перакладаліся з грэчаскай на славянскую мову ў X–XI стст., ствараліся да XVIII ст.), што перапісваліся ў тым ліку і на тэрыторыі Беларусі (ранейшы вядомы з іх – 1406 г.), у "Храналогіі" Андрэя Рымшы 1581 г., у

кананічна-Праваслаўнай па зместу “Малой падарожнай кніжыцы” (1/2 супадзенняў), надрукаванай Ф.Скарынай у 1522 г.. Тая “кніжыца” змяшчала і шэраг арыгінальных астранамічных звестак, але замежнага ад тэрыторыі Беларусі паходжання.

Шматлікія звесткі астранамічна-метэрэалагічнага плану, але ўжо як вынік менавіта мясцовага назірання, узгадваюцца ў позніх летапісах ВКЛ (XV–XVIII стст.), а таксама ў мемуарнай літаратуры XVII–XVIII ст. (“Дыярыўш” Я.А. Храпавіцкага, “Памятнікі” М. Матушэвіча, інш.): гэта надзвычайныя вобразы неба, свяцілаў, зацменні, з’яўленні камет, характарыстыкі асобых падзей надвор’я, асабліва ў экстрэмальных праявах, суправаджальныя меркаванні і апісанні іх уплыву на стан асяроддзя, гаспадарчае, і нават сацыяльнае становішча грамадства. Апавяданне пра каменны молат і звязаны з ім міф астранамічнага зместу (пра Сонца і 12 знакаў Задыяка), атрыманыя чэшскім грамадскім дзеячам Іеранімам Пражскім падчас наведавання ВКЛ (у 1412–13 гг.), пераказаў італьянскі святар Э. Пікіламіні (пазней Папа Рымскі Пій II) у кнізе “Еўропа” 1458 г.. Акрэсленыя матэрыялы адлюстроўваюць факт пільнай увагі мясцовага насельніцтва часоў сярэднявечча да ўсяго, што адбывалася на небе, а таксама імкненне асэнсаваць гэта, і пэўным чынам прымеркаваць да зямнога жыцця.

Асобую з’яву на гэтым шляху прадстаўляюць творы XV–XVII стст., якія змяшчаюць звесткі, разважанні і тлумачэнні рознатыповых нябесных з’яў, як метэрэалагічных, так і астранамічных. У тых творах відавочна імкненне да пэўнай сістэматызацыі звестак (што адлюстравана ў іх даволі строгай тэматычнай накіраванасці) і нават свайго роду навуковасці, на складаным прыродазнача-тэалагічным памежжы. У большасці тыя творы вызначаліся сучаснай ім грамадскай думкай, як апакрыфічныя (living рознага роду “Громники”, “Колядники”, “Лунники”, “Молниенники”, “Росписи царствам…”, “Слова…”, “Сказания о планетах, звёздах…”, “Часы на дни…” г.д.), якія пры тым магчыма ахарактэрызаваць, як пачаткова-навуковыя. Асабліва варта адзначыць адносную цярплівасць да твораў гэтага напрамку на тэрыторыі ВКЛ: гл., напрыклад зборнік 1482 г. “Книга зовомая Приточная, Васка писаря пана Миколая Радивиловича…” з артыкуламі “О течении месяца”, “Початок и указ, как восходит месяц, в какой час дня и ночи”, ці энцыклапедычны зборнік Жыровіцкага манастыра, сярэдзіны XVI ст., які змяшчае тлумачэнні нябесных з’яў: Месяца, сонечнай актыўнасці, грому, маланкі, а таксама прагнастычныя кліматычныя характарыстыкі, або павучальны зборнік “Ізмарагд” 1593 г. (перапісаны ў Супрасльскім манастыры Іванам Праскурам), які змяшчае адпаведныя артыкулы: “От шестодневника о солнци и луне, и о звездах и о планитах”, “О весеннем равноденстве”, зборнік XVI ст. “Сія книга о таинахъ

Божіих сложена філозофомъ великимъ Арістотелемъ іжъ на прозбу кролю Мацыдонскому великому Александрови, написалъ жэбы боялся Господа Бога одного", з перакладам артыкула "О седми звездах великих яже ся наричаются планеты, и силе их и о доме их" і шэрагам іншых твораў астралагічнага зместу, зборнік "Палея" XVI ст. Супрасльскага манастыра, з артыкуламі "О лунном течении, о величии неба, земли и звезд, о знаках небесных…", "О облацех", "О звездах", "О маланьях і грому". Але, у гэтай катэгорыі пісьмовых помнікаў крыніцамі вызначаюцца, пераважна, грэчаскія кнігі, і дагэтуль не вылучана творчая традыцыя менавіта мясцовага паходжання, таму на дадзеным этапе браць іх да падрабязнага разгляду прадстаўляецца немэтазгодным.

На адзначаным фоне з'яву асобага роду прадстаўляе спадчына знакамітага рэлігійнага і грамадскага дзеяча XVII ст. Сімяона Полацкага. Ён у сваіх работах таксама выкарыстоўваў своеасаблівыя тлумачэнні нябесных падзей, блізкія па накіраванасці да твораў вышэйадзначанай, пачаткова-навуковай катэгорыі, але прынцыпова імкнуўся суадносіць іх змест з Праваслаўным рэлігійным канонам. Між тым, у адносінах да закранутай катэгорыі помнікаў – гэта адзіны выпадак дакладнай фіксацыі аўтарства.

У перыяд XVI–XVIII стст. у Рэчы Паспалітай, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі, выдаваліся друкаваныя календары, комплекснага зместу, з астранамічным, а часта і з астралагічным каментарыем-тлумачэннем прагнастычнага плану. Яны зыходзілі з храналагічнага падмурку Хрысціянскага календара (да 1582 г. юліанскага, пазней грыгарыянскага). Дарэчы, сам працэс каляндарнай рэформы на тэрыторыі Беларусі адбываўся надзвычай драматычна, што адлюстравана ў "Баркулабаўскім летапісу", а таксама ў шматлікіх палемічных творах своеасаблівага напрамку – тэалагічнага і напаў-навуковага. З пачатку XVIII ст. змест публікацый у друкаваных календарах стаў пашырацца і прадстаўляў таксама звесткі па гісторыі царквы, краю, яго культуры, матэрыялы геаграфічныя, статыстычныя, палітычныя, а таксама гаспадарчыя планы і рэкамендацыі.

Упершыню агульнаабрадавая характарыстыка і апісанне каляндарнай падзеі (свята Ураджаю) ў Вялікім княстве Літоўскім (ВКЛ) былі прадстаўлены польскім храністам Я. Длугашам у кнізе "Гісторыя Польшчы…" (1455–80 гг.). Паведамленні пра некаторыя абрадавыя дзеянні традыцыйнага календара ВКЛ выкладзены польскім храністам М. Стрыйкоўскім (абрады з Дзядамі, захавальнікамі зямлі) у кнізе "Хроніка Польская, Літоўская, Жамойцкая і ўсяе Русі" (1582 г.), польскім навукоўцам Я. Ласіцкім (абрады Дзядоў, Жніва, Вяселля) у працы "Пра рэлігію, ахвярапрынашэнні, пахавальныя абрады русінаў, маскавітаў, татар…" 1582 г.. Італьянец А. Гваньіні ў кнізе "Хроніка Еўрапейскай Сарматыі…" (1578 г.) прывёў адзнакі народнай творчасці

Віцебшчыны і парадак працоўнага сельскага календара. Асобныя народныя прыказкі з каляндарнай прымяркаванасцю прывёў беларускі паэт С. Рысінскі ў кнізе "Любчынскі зборнік. 1800 польскіх прымавак" 1618 г.

З сярэдзіны XVIII ст. стыхійнае захапленне народнай творчасцю адчувальна паменьшылася, але напрыканцы яго пачала нараджацца цікавасць іншага, навуковага плану. Так, актыўную, мэтанакіраваную дзейнасць па збіранню фальклорных твораў, народных абрадаў разгарнулі гісторыкі А. Нарушэвіч, М. Тукальскі-Нелюбовіч, параўнальна разгорнутае апісанне некалькіх каляндарных абрадаў выклаў галандскі навуковец А. Меер у кнізе "Апісанне Крычаўскага графства…" 1786 г., у рэчышчы народнай спадчыны значны аспект старажытнага грамадскага права вылучаў гісторык Т. Чацкі, у кнізе "Аб літоўскім і польскім правах…" 1800 г., распрацоўваліся рознага роду праграмы і анкеты для дакладнага збору палявых матэрыялаў.

У цэлым, пісьмовыя помнікі першага этапу гістарыяграфіі прыводзяць шматлікія звесткі выпадковага характару, розных тэматычных накірункаў, у якіх закрануты тэмы язычніцага светапогляду, старажытнай храналагічнай тэрміналогіі і непасрэдна храналогіі падзей гадавога кола, некаторыя апісанні тых падзей, а таксама метэралагічныя, астранамічныя звесткі, і рознамэтавыя прыклады іх аналітычнай ацэнкі і пераасэнсавання.